8. *Грушевський М. С.* Історія України-Руси: В 11 т., Т. 4. / К.: Наук, думка, 1991.
9. *Кром, М. М.* Меж Русью и Литвой Пограничные земли в системе русско-литовских отношений конца XV - первой трети XVI в. / М.: Квадрига, 2010.
10. *Лойка, П.* Улада і кіраванне ў ВКЛ. Адміністрацыйна-тэрытарэальны падзел Беларусі // Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага княства Літоўскага. Мн., 2008.
11. *Львовская летопись*: Полное собрание русских летописей: в 43 т. / СПб.; М.; Л., 1841—2008 гг. Т. XX. СПБ, 1910.
12. *Любавский М. К.* Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого литовского статута / М.: Университетская, 1892.
13. *Любавский М. К.* Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно / М.: Московская художественная печатня, 1915.
14. *Мяцельскі А. А.* Мсціслаўскае княства і ваяводства ў XII–XVIII стст. / Беларуская навука, 2010.
15. *Пресняков А. Е.* Лекции по русской истории. т. 1–2. / М.: Государственное социально-экономическое издательство, 1939: Т.II. Выпуск 1. Западная Русь и Литовско-русское государство.
16. *Сагановіч Г. Н.* Пераход да Масквы ініцыятывы ў «збіранні» ўсходне-славянскіх зямель // Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага княства Літоўскага. Мн., 2008.
17. *Софийская вторая летопись*: Полное собрание русских летописей: в 43 т. / СПб.; М.; Л., 1841–2008 гг. Т. VI. Вып. 2. М.: Языки Русской культуры, 2001.
18. *Шталенков И.* К вопросу о «мстиславских» надчеканах // Банковский вестник. №3. 2012. с. 48–57.

# ДЗЕЙНАСЦЬ ОРГАНАЎ ЗЕМСКАГА САМАКІРАВАННЯ МІНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў 1911-1914 гг.

**А. М. Нагдалян**

Увядзенне выбарных земскіх органаў у трох беларускіх губернях, Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай, было зацверджана ўказам ад 14 сакавіка 1911 г. Згодна з ім на беларускія землі распаўсюджвалася «Палажэнне аб губернскіх і павятовых земскіх установах» 1890 г., якое дзейнічала ў цэнтральных расійскіх губернях. Закон уводзіўся таксама ў трох украінскіх губернях (Валынскай, Кіеўскай і Падольскай). Новыя земскія ўстановы замянілі ўпраўленні па справах земскай гаспадаркі, што функцыянавалі ў шасці заходніх губернях з 1903 г. і ўключалі ў сябе асноўныя функцыі земства, падобны механізм дзеяння, аднак былі пазбаўлены выбарнасці і пастаўлены пад большы кантроль адміністрацыі. Адсюль вынікае, што ў дадзеным выпадку назіралася пэўная пераемнасць, а не стварэнне земскіх устаноў з нуля.

Асаблівасцю ўказа 1911 г. стала замена саслоўных курый (сялянскай і памешчыцкай) на курыі нацыянальныя – «рускую» і «польскую». У «рускую» ўключалася праваслаўнае беларускае насельніцтва (па

сутнасці, усе, акрамя палякаў і яўрэяў), а ў «польскую» – каталіцкае. Для забеспячэння перавагі ў земстве за праваслаўнымі памешчыкамі пры размеркаванні выбаршчыкаў бралася сярэдняе арыфметычнае колькасці «рускага» і «польскага» насельніцтва і кошт іх нерухомай маёмасці (у працэнтах). У Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях не толькі дваранства, але і сялянства былі пераважна каталікамі. Пры такой сістэме падліку ўсё роўна пераважала б «польская» курыя, таму земствы ў названых губернях былі ўведзены. У функцыянальных адносінах земскія ўстановы, створаныя ў заходніх губернях паводле ўказа ад 14 сакавіка 1911 г., не адрозніваліся ад земстваў цэнтральных губерняў Расійскай імперыі [9, с. 20–23].

На фоне рэалізацыі на тэрыторыі Беларусі Сталыпінскай аграрнай рэформы важным напрамкам дзейнасці земскіх органаў Мінскай губерні сталі агранамічныя мерапрыемствы. На губернскім узроўні земскімі органамі паспяхова ажыццяўляліся пачынанні па правядзенні сельска-гаспадарчых выставак, паступова пашыраўся штат агранамічнага персанала, праводзіліся абследванні найбольш каштоўных парод жывёлы. Паспяховай стала дзейнасць у напрамку распаўсюджвання сельска-гаспадарчых ведаў сярод насельніцтва: арганізоўваліся цэнтральныя і перасоўныя адукацыйныя курсы для сялян, выдавалася спецыяльная літаратура ў чыста мясцовым асвятленні, створаны у 1914 г. свой уласны перыядычны орган «Веснік Мінскага губернскага земства» і інш.

Для больш эфектыўнага правядзення агранамічных пераўтварэнняў пад эгідай земства напрацягу 1911–1914 гг. былі правядзены глебава-геалагічнае і кліматычнае абследванне губерні, па выніках якіх складзены найбольш дакладныя для свайго часу карты. Паралельна наладжвалася доследная справа. Перш за ўсё, гэта стала карысным для правядзення ў жыццё меліярацыйных мерапрыемстваў на палесскіх балотах, што набывалі ў той перыяд асаблівы размах. Пры губернскай управе ствараліся спецыяльныя сельска-гаспадарчыя саветы і бюро, якія станавіліся арэнай для абмеркавання і вырашэння найбольш важных надзённых пытанняў. На павятовым жа ўзроўні ва ўсю разгортвалася ўладкоўванне сельска-гаспадарчых складоў, зернеачышчальных пунктаў і пракатных станцый, якія сталі надзейнай падтрымкай для мясцовага насельніцтва, што магло карыстацца іх паслугамі бясплатна альбо за нязначныя грашовыя сумы [1, с. 83–105; 3, с. 84–97; 8, с. 104–105].

Наступным значным напрамкам дзейнасці стала рэалізацыя земскімі ўстановамі праграмы па ўвядзенні ўсеагульнай пачатковай адукацыі і развіцці народнай асветы ў цэлым. Асноўныя сілы былі кінуты на паступовую арганізацыю агульнадаступнага пачатковага навучання,

абавязкі па рэалізацыі якога ў першую чаргу леглі на павятовыя земствы. Апошнія, аднак, эфектыўна ўключыліся ў яго ажыццяўленне і амаль у кожным павеце план выконваўся ў тэрмін. У цэлым расходы на адукацыю к 1914 г. склалі 1554000 руб. ці 36 % усяго бюджэта земства. У момант жа ўвядзення выбарных земскіх устаноў у 1911 г. расход на народную асвету складаў усяго толькі 15 %. Зусім з іншымі рэаліямі, тым не менш, земства сутыкнулася пасля пачатку Першай сусветнай вайны, калі асігнаванні на гэтыя патрэбы рэзка прыйшлося скараціць.

Да галоўнай заслугі губернскага земства можна аднесці пашырэнне сеткі тэхнічных устаноў, актуальнасць якіх ва ўмовах кардынальных агранамічных пераўтварэнняў узрастала ўсё больш. Нягледзячы на супрацьдзеянне ўладаў, земскія органы актыўна дабіваліся адкрыцця на беларускіх землях вышэйшай навучальнай установы. У выніку ў Мінску з 1914 г. пачаў дзейнічаць настаўніцкі інстытут са статусам сярэдняй навучальнай установы. Паралельна рыхтавался адкрыццё вышэйшай сельска-гаспадарчай адукацыйнай установы, праект якой быў зацверджаны ўрадам, аднак пачатак вайны не даў рэалізаваць гэтыя пачынанні. Традыцыйнай мерай земства заставался актыўная падтрымка навуковых і дабрачынных асветных арганізацый. Пры гэтым вялікую ролю земскія ўстановы адыгралі ў далейшым змяншэнні ўплыву царкоўна-прыхадской адукацыі і зацвярджэнні сярод насельніцтва іміджу свецкай адукацыі як найбольш якаснай. Тым не менш, безвыніковым стала пытанне па пашырэнні беларускай мовы і культуры, якое так і не заняло свайго месца ў земскай дзейнасці [1, с. 21–31; 4, с. 22–35; 6, арк. 15 адв.].

У той жа час адметнай была роля земскіх органаў у развіцці сферы аховы здароўя і стварэнні ўмоў для большай яе даступнасці насельніцтву. За 1911–1914 гг. тут земствамі дасягнуты значныя поспехі. Паўсюднае ўладкаванне сеткі новых бальніц, лячэбніц, фельдшарскіх пунктаў, паслугамі якіх бескаштоўна маглі карыстацца ўсе жыхары губерні, давала свой плён у падвышэнні агульнага стану здароўя насельніцтва і развіцці медыцыны ў цэлым.

Стабільна ішлі фінансавыя кампенсацыі ўстановам суседніх губерняў за лячэнне жыхароў Мінскай губерні і падрыхтоўку для яе патрэбных урачэбных кадраў. Разам з тым, на плечы земстваў ускладвалася арганізацыя барацьбы з эпідэміямі тыфу, дэзінтэрыі, халеры і інш., правядзенне якой, нягледзячы на шэраг недалікаў, можна лічыць здавальняючай. Рэгулярна земствы таксама пачалі накіроўваць свой персанал на курсы падвышэння кваліфікацыі і разнастайныя медыцынскія з’езды. Пры чым, акрамя ўвядзення пенсійнага забеспячэння работнікаў, пастановамі земскіх органаў гарантавалася

грашовая падтрымка сем’ям урачоў і іншых служачых у выпадку іх смерці падчас выканання сваіх прафесійных абавязкаў [3, с. 59–68; 1, с. 32–33].

Разам з тым, асобна патрэбна спыніцца на праблеме нацыянальнага прынцыпу фарміравання земскіх органаў. У выніку выбараў 1911 г. з 49 губернскіх галосных 39 спавядалі праваслаўе, 9 – каталіцтва і 1 – лютэранства. Члены ж губернскай управы першага трохгоддзя дзеяння земства былі выключна праваслаўнымі [7, арк. 52–53]. Традыцыйна ў гістарыяграфіі адзначаецца, што гэты прынцып спрыяў неэфектыўнасці ўстаноў на нашых землях. Тым не менш, гэта пытанне застаецца дыскусійным.

Сыходзячы з шэрагу крыніц, можна зрабіць выснову, што ўплыў дадзенага фактару на дзейнасць земскіх устаноў Мінскай губерні цяжка назваць адназначным. У сваіх успамінах гэта адзначаюць як прадстаўнікі правячых колаў, так і апазіцыйна настроеныя дваране-каталікі. Так грамадскі дзеяч і земскі галосны Э.А.Вайніловіч у сваіх мемуарах падкрэсліваў, што існаванне так званай «польскай» курыі безумоўна карысным, так як сярод дваран каталіцкага веравызнання панавала чаканне пазбаўлення іх права ўдзелу ў самакіраванні наогул. У выніку па прычыне моцных пазіцый у губернскім земстве такіх заўважных асоб як Р.А.Скірмунт, князь Г.Э.Друцкі-Любецкі, самога Вайніловіча і інш., галосным-каталікам удавалася задаваць тон на пасяджэннях.

Адметнай рысай заходніх земстваў было і тое, што яны ўспрымалі сябе выключна як мясцовы гаспадарча-эканамічны орган, прысвячаючы сваю дзейнасць толькі вырашэнню губернскіх праблем. Іншыя ж расійскія земствы, якія ў большасці бачылі сябе грамадска-палітычнай установай, значную колькасць часу на пасяджэннях праводзілі ў дыскусіях, ігнаруючы часам найбольш актуальныя праблемы [2, с. 117–118; 5, с. 172–174].

Такім чынам, выбарнымі земскімі установамі Мінскай губерні ў 1911–1914 гг. была праведзена велізарная работа, якая адыграла адметную ролю ў паляпшэнні сацыяльна-эканамічнага і культурнага становішча рэгіёна. У той жа час у працэсе свайго функцыянавання земства прыйшлося сутыкнуцца з шэрагам праблем, з-за якіх мноства ініцыятыў так і не атрымалася рэалізаваць. Тым не менш, існаванне земскіх устаноў стала важнай прыступкай для развіцця мясцовага самакіравання на беларускіх землях.

**Літаратура**

1. Вестник Минского губернского земства. 1914. №3–4.

2. *Войнилович Э. А.* Воспоминания: Пер. с польск. / Общ. ред. В. Завальнюка. Минск: Издание Минской римо-католической парафии св. Симона и Елены, 2007. 380 с.
3. Журналы первого очередного Минского губернского земского собрания сессии 25 января – 7 февраля 1912 г. Минск: Губернская типография, 1912. 143 с.
4. Журналы третьего очередного Минского губернского земского собрания сессии 20–28 января 1914 г. Минск: Губернская типография, 1914. 143 с.
5. *Друцкой-Соколинский В. А.* На службе Отечеству: Записки русского губернатора (1914–1918 гг.) / В.А.Друцкой-Соколинский. Орел: РКФ «3 июля»: РИГ «Невероятный мир», 1994. 405 с.
6. НГАБ. Фонд 324. Воп. 1. Спр. 928. Журнал первого чрезвычайного минского губернского земского собрания заседаний 20-23 августа 1911 г.
7. НГАБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 23. Списки лиц избранных или зачисленных в уездные земские гласные по уездам Минской губернии.
8. Отчет Минской губернской земской управы за 1913 год. Минск: Губернская типография, 1914 г. 236 с.
9. *Талмачова С. А.* Распаўсюджанне земскай рэформы ў заходніх губернях Расійскай імперыі (1903–1911 гг.) // Весці БДПУ. Сер. 2. 2010. № 4. С. 20–24.

## МОНГОЛЬСКОЕ НАШЕСТВИЕ НА ВОЛЖСКУЮ БУЛГАРИЮ

**И. А. Палачанин**

В 1220–1230-е гг. Волжская Булгария, как и многие страны и народы Евразии, пережила мощный удар извне – монгольское нашествие, которое привело к ее разгрому и исчезновению с политической карты мира.

К началу 1220-х гг. монголы разгромили и захватили крупнейшие культурные, экономические и политические центры Центральной Азии. Булгары, тесно связанные с другими мусульманскими народами, быстро узнали об этом и стали энергично укреплять свои границы на западе. В 1220 г. (по сообщению ряда летописей в 1219 г. или в 1221 г.), узнав о готовящемся против них походе великого князя владимирского Юрия Всеволодовича, булгары трижды отправляли к нему послов и только с третьей попытки уговорили заключить мир, «яко же было при отце его Всеволоде и при деде его Георгии Володимеричи» [7, с. 128; 8, с. 86; 9, с. 332; 17, с. 62].

В 1223 г. монгольские войска под предводительством Субедэя и Джэбэ прошли через Дербент в степи Причерноморья, и у Азовского моря в битве на р. Калке разгромили объединенное русско-половецкое войско. После этой победы монголы повернули в сторону Волжской Булгарии, но там их ждал жестокий разгром. Булгары узнали о приближении противника и заранее подготовились к вторжению. По сообщению арабского историка Ибн аль-Асира «они в нескольких местах устроили им засады, выступили против них (татар), встретились с ними и, заманив их до тех пор, пока они зашли за место засад, напали на них с тыла, так что они (татары) остались в